База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# ШКОЛА ТРОХ ГЕРОЯЎ

У гэтай школе вучыліся Герой Савецкага Саюза Склязнёў Георгій Міхайлавіч (1911—1937), які загінуў у барацьбе з фашызмам у Іспаніі, Герой Савецкага Саюза Шандалаў Юрый Абрамавіч (1923—1945), які загінуў у баях за Радзіму, Герой Савецкага Саюза Каленікаў Іван Емяльянавіч (1912—1969) — сведчыць мемарыяльная дошка на СШ № 2, што ў Навабеліцкім раёне Гомеля. Тры Героі з адной школы! Такое, згадзіцеся, сустракаецца не часта.

Першым з іх стаў Героем Георгій Склязнёў. Першым са 118 Герояў Савецкага Саюза — нашых землякоў.

Г. М. Склязнёў пражыў кароткае жыццё, але паспеў зрабіць вельмі многае. Пасля заканчэння школы працаваў на будаўніцтве лесакамбіната. У 1931 годзе стаў студэнтам Маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча імя Баумана. Праз год у адказ на заклік Ленінскага камсамола паступіў у танкавае вучылішча, пасля заканчэння якога служыў у адной з часцей Беларускай ваеннай акругі.

Калі летам 1936 года рэспубліканская Іспанія падверглася ўзброенай інтэрвенцыі з боку італа-германскага блока, лейтэнант Георгій Склязнёў у ліку слаўных савецкіх добраахвотнікаў едзе туды і становіцца байцом інтэрнацыянальнай брыгады. У адным з баёў фашысты падпалілі машыну яго баявога таварыша. Рызыкуючы жыццём, Склязнёў выратоўвае танк і экіпаж. Гэты адважны ўчынак замацаваў за савецкім воінам-танкістам славу сапраўднага героя, вернага сябра іспанскіх байцоў.

12 лютага 1937 года мяцежнікі імкнуліся любой цаной фарсіраваць раку Харама ў раёне Арганды, але ўсякі раз натыкаліся на трывалую абарону. У адной з контратак машина Склязнёва ішла ўперадзе танкаў роты, якой ён камандаваў, і вяла трапны агонь па фашыстах. Вораг сканцэнтраваў па танку ротнага стральбу некалькіх гармат. Полымя ахапіла машыну, але экіпаж мужна працягваў весці бой. Палаючы танк усё страляў і страляў па ворагу да апошняга снарада.

За адвагу і вернасць воінскаму абавязку лейтэнант Георгій Міхайлавіч Склязнёў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, а 27 чэрвеня 1937 года пасмяротна ўдастоены звания Героя Савецкага Саюза. ён навечна залічаны ў спісы асабовага саставу ваеннага вучылішча, якое закончыў. Рашэннем гарвыканкома ў 1965 годзе вуліца Каранеўская перайменавана ў вуліцу Склязнёва. Яго імем названа школа, у якой ён вучыўся.

Другім Героем Савецкага Саюза з выпускнікоў школы стаў Іван Емяльянавіч Каленікаў. Гэтае званне яму было прысвоена 10 студзеня 1944 года за мужнасць, праяўленую ў баях на Кіеўскім напрамку, 4-7 лістапада 1943 года, ён, намеснік камандзіра танкавай брыгады, кіраваў боем, у час якога была ачышчана ад фашыстаў чыгуначная станцыя Жуляны і перарэзана шаша Кіеў—Жытомір. 7-8 лістапада падраздзяленне гвардыі маёра І. Е. Каленікава разграміла перадавы атрад варожай танкавай дывізіі, нанесла яму вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

Жыццё Івана Емяльянавіча было не з лёгкіх. Як толькі закончыў школу, пайшоў працаваць на паравозавагонарамонтны завод. У 1933 годзе быў прызваны ў армію, дзе закончыў танкавае вучылішча, акадэмічныя курсы пры ваеннай

акадэміі бранятанкавых войск. Удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі і ў савецка-фінляндскай вайне. Вялікую Айчынную правёў ад першага і да апошняга дня. Да 1957 года палкоўнік І. Е. Каленікаў служыў у Савецкай Арміі. Памёр 14 жніўня 1969 года.

Юрый Абрамавіч Шандалаў у дзяцінстве марыў стаць настаўнікам, але педагагічнай дзейнасцю яму заняцца не давялося — перашкодзіла вайна. Разам з трыма братамі і сястрой ён пайшоў абараняць Радзіму ад фашысцкіх захопнікаў. У баі з імі Юрый не раз праяўляў мужнасць І адвагу, за што быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Айчыннай вайны І ступені.

16 красавіка 1945 года штурмавая рота старшага лейтэнанта Юрыя Шандалава, уклініўшыся ў варожую абарону на заходнім беразе Одэра ў раёне Гроснейендорфа, стойка адбівала контратакі праціўніка. Калі ля супрацьтанкавай гарматы, якая падтрымлівала яго роту, выйшаў запас снарадаў, Шандалаў з двума байцамі прасунуўся наперад. З трафейнага фаустпатрона ён падбіў галаўны танк, а затым і другую машыну. Але вось закончыліся фаустпатроны, зрасходаваны дыскі трох аўтаматаў. Забіты абодва байцы. Фашысты, адчуўшы гэта, кінуліся на афіцэра. Адбіваючыся кінжалам, Юрый закалоў аднаго з іх, але быў аглушаны прыкладам. Калі воіны часці, у якой служыў Юрый Шандалаў, адцяснілі ворага, на месцы няроўнага бою ляжала цела адважнага ротнага, а вакол яго 48 забітых гітлераўцаў.

15 мая 1946 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Юрыю Абрамавічу Шандалаву пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Рашэннем гарвыканкома ў 1965 годзе вуліца Лесапаркавая была перайменавана ў вуліцу Героя Савецкага Саюза Шандалава.

**Ф. СТЭЛЬМАШОК, падпалкоўнік у адстаўцы.**

**М. ЦАРКОЎ, падпалкоўнік у адстаўцы.**

Стэльмашок, Ф. Школа трох герояў / Ф. Стэльмашок, М. Царкоў // Гомельская праўда. – 1985. – 14 лютага (№ 32).